# Знайсці і захаваць: ваенна-мемарыяльная работа ў Віцебскім раёне

УДК 94(476)+908



**Мікалай ПІВАВАР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

Мікалай ПІВАВАР. Знайсці і захаваць: ваенна-мемарыяльная работа ў Віцебскім раёне. У артыкуле разглядаецца досвед у справе ўвекавечання памяці пра абаронцаў Айчыны і захавання памяці аб ахвярах вайны. Аўтар уздымае наступныя пытанні: як актывізаваць пошукавую працу, выявіць няўлічаныя пахаванні часоў вайны, правесці мемарыялізацыю, пазбегнуць двайнога ўліку, захаваць помнікі, прысвечаныя вайне, якія не маюць дзяржаўнай аховы, і іншыя.
Ключавыя словы: увекавечанне, захаванне памяці, ваенна-мемарыяльная работа, звод помнікаў, аўтаматызаваны банк даных, ахвяры вайны.

Mikalai PIVAVAR. Find and perpetuate: Military memorial work in Vitebsk Region. The article examines the experience of perpetuating the memory of Fatherland defenders and preserving the memory of the victims of war. It look into several issues: ways to intensify search activities and identify the names of unknown soldiers; ways to find unknown graves of victims of war and to save memorials and monuments dedicated to the Great Patriotic War.
Keywords: memorialization, preservation of memory, military memorial work, set of monuments, automated data bank, victims of war.

Для нашага народа апошняя вайна была самым цяжкім выпрабаваннем. Акрамя матэрыяльных і людскіх страт, стаяла пытанне аб самім існаванні нацыі і дзяржавы. Увекавечанне і захаванне памяці пра абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны з'яўляецца важным элементам дзяржаўнай палітыкі ў сферы ідэалогіі. Вялікае значэнне ў захаванні памяці пра падзеі вайны, трансляцыі ведаў пра мінулае належыць ваенння-мемарыяльнай рабоце, якая таксама садзейнічае выхаванню пачуцця патрыятызму ў падрастаючага пакалення.

Палітыка ў галіне ўвекавечання памяці пра абаронцаў Айчыны рэгламентуецца Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 сакавіка 2016 года № 109 «Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и

## ПРА АЎТАРА

ПІВАВАР Мікалай Васільевіч.

Нарадзіўся ў 1971 годзе ў в. Лужасна Віцебскага раёна. Скончыў у 1993 годзе Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага (цяпер Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка).

З 1993 года выкладаў гісторыю ў Віцебскім кадэцкім вучылішчы (да 2011 года – Лужаснянская гімназія для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці). З 2007 года працуе на кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Дэпутат Віцебскага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Кандыдат гістарычных навук (2007), дацэнт (2012).

Аўтар больш за 160 навуковых работ, у тым ліку 12 кніг і манаграфій.

Сфера навуковых інтарэсаў: краязнаўства Беларусі, грамадскае жыццё краіны 2-й паловы XX стагоддзя, турыстычныя рэсурсы і музейнае будаўніцтва Віцебшчыны, сядзібазнаўства.

сохранении памяти о жертвах войн» *[1]*. Дзяржаўны ўлік воінскіх пахаванняў і магіл ахвяр вайны ўскладаецца на Міністэрства абароны і мясцовыя тэрытарыяльныя распарадчыя органы. У структуры Міністэрства абароны ўтворана ўпраўленне па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны. У складзе Узброеных Сіл дзейнічае 52-гі асобны спецыялізаваны пошукавы батальён.

Ёсць і Дзяржаўная праграма па ўвекавечанні загінулых пры абароне Айчыны і захаванні памяці аб ахвярах вайны на 2021–2025 гады *[2]*. Пастановай Савета Міністраў у 2018 годзе былі зацверджаны «Правілы добраўпарадкавання мемарыялаў, помнікаў воінскай славы, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войнаў» *[3]*. Міністэрствам абароны распрацаваны Інструкцыі аб парадку дзяржаўнага ўліку воінскіх пахаванняў *[4]*, аб парадку правядзення палявых пошукавых работ з удзелам членаў грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян *[5]*.

Прыярытэтамі дзейнасці дзяржаўных органаў з'яўляюцца: выяўленне і перапахаванне астанкаў загінулых, запаўненне аб'яднаных баз даных і звязаная з гэтым верыфікацыя інфармацыі, добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў, ваенна-патрыятычныя мерапрыемствы выхаваўчай накіраванасці.

Аднак пры ўсіх значных дасягненнях па ўвекавечанні памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны застаюцца нявырашанымі наступныя пытанні:

– інвентарызацыя месцаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, не ўсюды праведзена належным чынам. Застаецца даволі шмат няўлічаных пахаванняў часоў вайны, у першую чаргу ахвяр вайны;

– значная колькасць пахаваных воінаў не ідэнтыфікавана. Імёны тысяч загінулых абаронцаў Айчыны невядомы. Праблема пастулова вырашаецца шляхам аналізу дакументаў і матэрыялаў, размешчаных у аб'яднанай базе даных «Мемарыял», зверкі іх з раённымі кнігамі «Памяць», уліковымі дакументамі сельскіх Саветаў, райвыканкамаў і інш.;

– запаўненне аўтаматызаванага банка даных «Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь» ідзе не так хутка, як хацелася б. Напрыклад, з 62 тыс. салдат, якія загінулі ў гады вайны на тэрыторыі Віцебскага раёна, у базу ўнесены імёны 34 тысяч, а ахвяр вайны, якіх больш за 15 тысяч, унесена толькі 34 чалавекі;

– ёсць праблема, звязаная з верыфікацыяй звестак, нанесеных на мемарыялах. Пры перапахаванні часам атрымлівалася так, што загінулы воін нідзе не ўлічаны: ні на надмагільнай пліце, ні ў спісе ў сельсавеце. Ці, наадварот, бываюць выпадкі, калі салдат лічыцца пахаваным адразу ў некалькіх месцах. Такія перапахаванні праводзіліся часам фармальна, і некаторыя першасныя магілы засталіся неперанесенымі, але знішчанымі, хоць паводле дакуметаў – перанесенымі.

Значная частка помнікаў і памятных месцаў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, не знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Адпаведна Указу № 109 Прэзідэнта дзяржаўнай ахове падлягаюць толькі пахаванні (воінскія і ахвяр вайны). Кодэкс аб культуры (у частцы аховы гісторыка-культурнай спадчыны) ахоўвае толькі тыя аб'екты, якія абвешчаны гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, а іх адносна няшмат. У 1985 годзе ў спіс помнікаў Віцебскай вобласці было ўключана 2739, з якіх большасць прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны *[6]*. У 2006 годзе прыняты Закон аб гісторыка-культурных каштоўнасцях, і статус помніка гісторыі і культуры з воінскіх пахаванняў быў зняты. У новы Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі ў Віцебскай вобласці былі ўнесены толькі 873 аб'екты *[7]*. У Віцебскім раёне ў 1985 годзе пад аховай дзяржавы знаходзілася 71 брацкая магіла і вайсковыя могілкі *[6, с. 177–200]*. На 2022 год толькі 26 з іх маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У той жа час статус гісторыка-культурнай каштоўнасці не атрымалі помнікі, якія маюць высокую мастацкую і эстэтычную вартасць, звязаны з важнымі і ключавымі падзеямі вайны. Напрыклад, помнік дзецям М.П. Шмырова, Герою Савецкага Саюза А.Я. Углоўскаму, савецкім лётчыкам каля в. Вароны Віцебскага раёна.

Такім чынам, ⅔ помнікаў, памятных знакаў, мемарыяльных шыльдаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны, не маюць ахоўнага статусу. Не ўключаны цэлыя катэгорыі: месцы загубы савецкіх грамадзян, месца спаленай вёскі, месца былога канцлагера, месца былога гета; помнік савецкім воінам; помнік савецкім воінам і падпольшчыкам; помнік вызвалення; курган памяці; помнік, мемарыяльная дошка ў памяць аб загінулых



**Добраўпарадкаванне месца пахавання ахвяр вайны каля в. Трыгубцы**



**Добраўпарадкаванне магілы партызана ў в. Чырвоны Двор**

земляках; помнік партызанскай славы; помнік, мемарыяльная дошка падпольшчыкам; месца бою; месца гібелі; месца подзвігу; месца партызанскага лагера; месца базіравання штаба партызанскай брыгады; месца базіравання падпольнага райкама КП(б)Б і ЛКСМБ і інш. Трэба адзначыць, што большасць з іх даглядаецца мясцовымі ўладамі, гэта добрая воля нашых грамадзян і кіраўніцтва раёна.

Яшчэ адно пытанне: як скараціць выдаткі на падтрыманне годнага стану пахаванняў ахвяр вайны і помнікаў, якія знаходзяцца ў аддаленых месцах. Штогод іх трэба добраўпарадкоўваць, фарбаваць, рамантаваць, грэйдзіраваць ці аднаўляць дарогу да помнікаў. Ускладаюцца гэтыя абавязкі на мясцовыя органы, якія маюць вельмі абмежаваныя сродкі, як людскія, так і фінансавыя.

Магчыма, варта распрацаваць праект універсальнага памятнага знака, прысвечанага ахвярам вайны, які можна было б усталяваць на месцы спаленых населеных пунктаў. Настаў, нарэшце, час актыўней выкарыстоўваць дасягненні НТР пры правядзенні мемарыялізацыі памятных месцаў, звязаных з падзеямі вайны. Варта каля помнікаў і пахаванняў усталёўваць інфармацыйна-мемарыяльныя шыльды, на іх наносіць QR-коды, якія адпраўлялі б на старонкі, дзе змяшчаецца пашыраная інфармацыя (імёны, абставіны падзей, фотаздымкі, ілюстрацыі і інш.).

Існуе праблема ўліку і надання ахоўнага статусу месцам памяці пра падзеі вайны, што з'явіліся нядаўна, ушанаваны дзякуючы грамадзянскім ініцыятывам. Напрыклад, на месцах жорсткіх баёў, спаленых вёсак, гібелі экіпажаў самалётаў і інш. Большасць з іх узведзены з пэўнымі парушэннямі патрэбнай працэдуры ўзгаднення з Міністэрствам культуры. Юрыдычна яны па-за законам, але яны існуюць і трэба ці зносіць іх, што выклікае незадавальненне мясцовых жыхароў, ці правесці пэўную «амністыю» і спрошчаную працэдуру рэгістрацыі.

Яшчэ адна з трагічных старонак гісторыі вайны ў нашай краіне – Халакост. У савецкі час на месцах знішчэння вязняў гета ставілі помнікі і пісалі проста – «мірныя савецкія грамадзяне». Цяпер сваякі і актывісты дабіваюцца размяшчэння дакладнай інфармацыі пра нацыянальнасць у месцах Халакосту. Дададзім, што не ўсе месцы памяці Халакосту і магілы ахвяр вайны ўключаны ў зводную ўліковую ведамасць воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр вайны. Напрыклад, у Віцебскім раёне гэта пахаванні каля в. Янавічы (1200 ахвяр), каля в. Ахруткі (400 ахвяр), якія раней мелі дзяржаўную ахову, але цяпер яе не маюць.

## Магчымыя варыянты вырашэння

На наш погляд, пад ахову дзяржавы акрамя воінскіх пахаванняў павінны быць узяты і помнікі, архітэктурныя збудаванні і іншыя аб'екты, якія ўвекавечваюць памяць пра вайну. Гэта можа адбыцца шляхам унясення пэўных дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта № 109 ці прыняццем Закона аб увекавечанні падзей Вялікай Айчыннай вайны, як гэта прадугледжвала пастанова Савета Міністраў у 1992 годзе. Яшчэ адзін магчымы спосаб: уключыць усе помнікі, прысвечаныя вайне, у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Аднак гэта павялічыць яго на некалькі тысяч аб'ектаў, большасць з якіх выкананы па тыпавых праектах, на невысокім мастацкім узроўні і не маюць асаблівых эстэтычных якасцей. Уключэнне іх у спіс запатрабуе сур'ёзных дзяржаўных фінансавых выдаткаў. Адзначым пры гэтым, што гістарычная, ідэалагічная, выхаваўчая важнасць такіх помнікаў відавочна.

Трэці варыянт прадугледжвае стварэнне асобнага Зводу помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны ў кожным раёне і ўзяцце аб'ектаў пад ахову мясцовымі органамі ўлады. Пры гэтым правільна будзе надаць статус гісторыка-культурных каштоўнасцей найбольш значным помнікам вайны, тым, якія маюць высокую мастацкую і эстэтычную вартасць, а таксама звязаны з важнымі і ключавымі падзеямі вайны.

Спашлёмся на ўласны вопыт. У Віцебскім кадэцкім вучылішчы намі была праведзена пэўная работа па выяўленні невядомых месцаў, звязаных з падзеямі вайны. На працягу 2018–2021 гадоў падчас палявых даследаванняў на тэрыторыі Віцебскага раёна былі выяўлены больш за 100 няўлічаных пахаванняў – воінскіх і ахвяр вайны. Рашэннем Віцебскага раённага выканкама ад 16 лістапада 2018 года прынята пастанова аб стварэнні Зводу помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны. Досвед выклікаў цікавасць у кіраўніцтва вобласці: пасля нашага выступлення на X сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 21 сакавіка 2019 года было прынята рашэнне аб стварэнні такіх зводаў у кожным раёне вобласці, а на іх аснове – утварэння абласнога Зводу помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны. У 2021 годзе ўбачыла свет выданне «Звод помнікаў воінскай славы, памятных месцаў, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр Вялікай Айчыннай вайны Віцебскага раёна» *[8]*. У кнізе сабрана інфармацыя пра ўсе выяўленыя ў раёне помнікі і аб'екты Вялікай Айчыннай вайны. У баях 1941–1944 гадоў на тэрыторыі Віцебскага раёна загінула больш за 62 тыс. савецкіх салдат, нацысты знішчылі больш за 15 тыс. жыхароў. Пад аховай дзяржавы знаходзяцца 115 пахаванняў (воінскіх могілак – 3, брацкіх магіл – 80 (з іх шэсць пахаванняў ахвяр вайны), індывідуальных – 30. Дваццаць сем воінскіх пахаванняў маюць статус гісторыка-культурных каштоўнасцей і адзін помнік – «Віцебскія вароты» ў в. Заполле. У выданні зроблена спроба ўлічыць усе месцы, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Такімі, на нашу думку, з'яўляюцца: воінскія пахаванні і пахаванні ахвяр вайны (і ўзятыя пад ахову, і тыя, што выяўлены, але пакуль не ахоўваюцца); помнікі, мемарыяльныя дошкі, памятныя шыльды, звязаныя з вайной і ўсталяваныя на памятных месцах – значных і жорсткіх баёў, здзяйснення подзвігаў, дзеяння партызанскіх атрадаў, падпольных органаў савецкай улады і КПБ(б), радзімы герояў і іншых; сведчанні вайны – рэшткі фартыфікацыйных збудаванняў (доты, бліндажы, бункеры), траншэі, акопы і іншыя аб'екты на месцах былых баёў.

У выданні падаюцца звесткі пра 285 аб'ектаў, выяўленых на 2020 год на тэрыторыі Віцебскага раёна. З іх 103 помнікі, шыльды, памятныя месцы, 115 пахаванняў воінскіх і ахвяр вайны, што ўзяты на ўлік дзяржавай, 63 пахаванні, якія з розных прычын не ўзяты на ўлік. Матэрыял пра кожны аб'ект суправаджаецца кароткай даведкай, фотаздымкам, каардынатамі, спісам выкарыстаных крыніц. У якасці дадаткаў змяшчаецца інфармацыя пра страчаныя на тэрыторыі раёна помнікі; вядомыя, але з розных абставін нявыяўленыя пахаванні; помнікі ў вёсках, што ўвайшлі ў склад г. Віцебска. У канцы кнігі змешчаны «Алфавітны спіс помнікаў і пахаванняў» і «Спіс аб'ектаў па сельскіх Саветах». Выданне мае навукова-папулярны характар і накіравана на перадачу памяці аб падзеях вайны наступным пакаленням, папулярызацыю ведаў пра яе, выхаванне патрыятызму, гістарычнай памяці.

Кніга ўжо актыўна выкарыстоўваецца ў дзейнасці рабочай групы па расследаванні справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На працягу 2021 года супрацоўнікі пракуратуры г. Віцебска выязджалі на 55 месцаў, пазначаных у кнізе. 6 красавіка 2022 года адбылася сустрэча Генеральнага пракурора Беларусі з кадэтамі, якія займаюцца пошукавай справай, і была дадзена высокая ацэнка праведзенай намі рабоце.

Праца па выяўленні і ўвекавечанні працягваецца. Колькасць выяўленых пахаванняў, асабліва ахвяр вайны, павялічваецца. Ёсць ідэя на аснове кнігі распрацаваць электронную базу даных і выкласці яе ў інтэрнэце з магчымасцю дапаўнення і ўдаклanення інфармацыі. Сюды можна будзе дадаваць больш фота, спісы загінулых, артыкулы, нарысы пра помнікі, пахаванні, асоб.

## Выяўленне імён ахвяр вайны і запаўненне аб'яднанай базы даных «Ахвяры вайны Віцебскага раёна»

Вельмі актуальным у сувязі з расследаваннем справы аб генацыдзе беларускага народа стала выяўленне імён ахвяр вайны і ўнясенне іх у аб'яднаную базу даных «Ахвяры вайны Віцебскага раёна». Як ужо адзначалася, на тэрыторыі раёна гітлераўскімі акупантамі было знішчана больш за 15 тыс. жыхароў, у аўтаматызаваны банк даных «Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь» унесены імёны толькі 34 чалавек.

Шляхам архіўна-даследчай працы кадэты змаглі ўстанавіць амаль 5 тыс. імён ахвяр вайны. Аналіз архіўных дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь *[9]* і Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці *[10]* даў амаль дзве тысячы імён. Яшчэ 2,8 тысячы атрыманы пры алічбаванні кнігі «Памяць» Віцебскага раёна. У палявых даследаваннях (агляд могілак, апытанні мясцовых жыхароў, сведак падзей, іх сваякоў, выяўленне няўлічаных пахаванняў часоў вайны і інш.) устаноўлены імёны 96 ахвяр вайны. У выніку аналізу артыкулаў мясцовага перыядычнага друку атрыманы 14 персаналій. Пры ўсёй значнасці зробленага пакуль удалося выявіць імёны толькі трэці з забітых мірных грамадзян, але праца працягваецца.

Падчас пошуку імён (у архіўна-даследчай рабоце і палявых даследаваннях) і запаўнення аб'яднанай базы даных з'віліся некаторыя праблемы і спрэчныя пытанні, якія перашкаджаюць вызначэнню імён ахвяр вайны і захаванню памяці пра іх.

**Кадэты слухаюць успаміны жыхаркі в. Бараўляны**



«Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь» вядзецца на рускай мове. Спісы прозвішчаў ахвяр вайны ў раённай кнізе «Памяць» створаны на беларускай. Пры перакладзе прозвішчаў з беларускай мовы на рускую магчымы памылкі, а ў шэрагу выпадкаў, калі ў асоб невядомыя імёны, а толькі ініцыялы, правільны пераклад іх на рускую мову немагчымы таму, што ў частцы рускіх і беларускіх імён не адпавядаюць першыя літары. Не ведаючы поўнага імя, не зможам правільна перакласці яго з беларускай мовы на рускую. Верагодна, варта запаўняць аб'яднаныя базы даных па ахвярах вайны на дзвюх мовах. Беларуская мова – дзяржаўная і мова тытульнай нацыі.

Калі запаўняць па графах, як у «Кнізе Памяці Рэспублікі Беларусь» для загінулых

**Устаноўка абеліска невядомаму лётчыку ў в. Чырвоная Іскра**



і пахаваных у раёне воінаў, то многія графы не патрэбны, напрыклад: час і месца прызыву, месца службы, нумар в/ч, воінскае званне, Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Затое абавязкова трэба графа «Заўвагі» для дадатковай інфармацыі.

Яшчэ адно пытанне: ідэнтыфікацыя і ўлік асоб у пахаваннях ахвяр вайны. Як вызначыць імёны людзей, якія пахаваны ў брацкіх магілах без указання звестак пра іх? Напрыклад, у в. Чырвоны Двор на помніку ёсць надпіс: «Маскалевы Марк Федосович, Мария Касьяновна, Татьяна, Наталья и еще 8 человек их дети расстреляны в 1943 году». А ў в. Уласава на могілках на мемарыяле чытаем: «Моисееву Ивану Парфеновичу и его семье. Погибли XI.1942 г.». Колькі асоб трэба ўносіць у базу даных на аснове надпісу з пахавання «Здесь похоронена семья Тетеркиных, погибшая в 1942 г.»? Магчыма, улічваючы склад сярэдняй сям'і на той час.

Усё зразумела, калі ёсць вычарпальная інфармацыя на помніку: забіты фашыстамі, забіты карнікамі, загінулі ад рук гітлераўскіх катаў і г. д. Аднак як быць, калі выяўлена пахаванне ахвяр вайны, але без пазначэння прычын гібелі, толькі дата? Зразумела, калі прозвішча ёсць у кнізе «Памяць». А калі няма? Сустракаюцца помнікі і без інфармацыі на іх. Шыльда была, але страчана, ці надпіс не чытаецца. А калі звесткі атрыманы толькі з вусных крыніц і няма дакладнай інфармацыі пра прозвішчы ахвяр, час і абставіны іх гібелі? Якія звесткі могуць быць падставамі для ўзяцця на ўлік такіх пахаванняў? Ці дастаткова сведчанняў мясцовых жыхароў? Што рабіць, калі і такія звесткі малаінфарматыўныя?

Якія пахаванні ахвяр вайны трэба браць пад ахову дзяржавы? Пры належным пошуку колькасць пахаванняў ахвяр вайны можа ўзрасці ў некалькі разоў. Калі ўсе іх браць на ўлік, гэта вельмі павялічыць выдаткі на іх утрыманне. Магчыма, варта вызначыць пэўныя крытэрыі для падставы ўзяцця на дзяржаўны ўлік і пад ахову. Брацкія магілы – безумоўна, трэба браць на ўлік усе. Па індывідуальных трэба правесці дыскусію з удзелам пошукавікаў, упраўлення па ўвекавечанні Міністэрства абароны, мясцовых органаў улады і іншых зацікаўленых бакоў.

Наступнае пытанне – верыфікацыя. Частка населеных пунктаў былога Суражскага раёна і Віцебскага (даваеннага і да 1961 года) не ўваходзіць у склад сучаснага Віцебскага раёна. Напрыклад, в. Баркова ўваходзіла ў склад Віцебскага, але цяпер гэта тэрыторыя Гарадоцкага раёна. Ці ў Баркове былі забіты жыхары навакольных

вёсак, якія цяпер у складзе Віцебскага раёна, значыць, іх могуць улічваць і па месцы жыхарства, і па месцы знішчэння. Каб пазбегнуць двайнога ўліку, трэба вырашыць, дзе канчаткова залічваць ахвяр вайны, а адкуль іх выключаць – у месцы пахавання (Гарадоцкі раён) ці месцы паходжання (Віцебскі раён).

Яшчэ адзін нюанс: нацызм ці фашызм? Некаторыя сучасныя даследчыкі не прымаюць старых фармулёвак, якія ўжываліся ў савецкі час, напрыклад «нямецкія фашысты», «гітлераўскія захопнікі». Яны лічаць, што трэба выкарыстоўваць тэрмін «нацызм» і яго вытворныя. З аднаго боку, гэта справядліва, бо фашызм – тэрмін, які характарызуе грамадска-палітычную сістэму, што існавала ў Італіі ў 1919–1943 гадах. У той жа час большасць насельніцтва сталага веку не разумее новых фармулёвак і жадае прытрымлівацца тых тэрмінаў, якія для іх звыклыя і зразумелыя. Якую тэрміналогію лепей ужываць на інфармацыйных шыльдах?

Для інвентарызацыі і выяўлення невядомых воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр вайны ў кожным раёне створаны рабочыя групы, але праца іх часам фармальная. Магілы часоў вайны імі амаль не выяўляюцца, імёны ахвяр забываюцца. А апошнія сведкі, якія яшчэ могуць указаць месцы такіх пахаванняў ці ўдакладніць звесткі пра людзей і абставіны іх гібелі ў недалёкай будучыні адыдуць у нябыт. Як актывізаваць дзейнасць камісій? Як матываваць іх на плённую працу? Думаем, што варта прыцягваць да супрацоўніцтва з дзяржаўнымі органамі краязнаўцаў, настаўнікаў, бібліятэкараў, музейных работнікаў і іншых неабыякавых асоб.

Існуе праблема ідэнтыфікацыі месцаў былых населеных пунктаў (геаграфічных каардынат). Некаторых вёсак, хутароў даўно няма, на картах яны не абазначаны, мясцовыя іх не ведаюць, доступ да іх абмежаваны (ворная зямля, засаджаны лесам, адсутнічаюць дарогі). Вырашэнню праблемы можа дапамагчы стварэнне даведніка калгасаў раёна. У дакументах часоў вайны і першых пасляваенных гадоў прывязка часта ішла не да населеных месцаў, а менавіта калгасаў. Цяпер калгасаў (як і шэрагу вёсак) няма. І калі месца знаходжання былой вёскі можна ўдакладніць у райвыканкаме, то спіса калгасаў не існуе.

## Мы павінны помніць

На заканчэнне хацелася б адзначыць яшчэ адзін кірунак працы па захаванні памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, у якім актыўна ўдзельнічаюць выхаванцы Віцебскага кадэцкага вучылішча. Гэта ўсталяванне ў Віцебскім раёне на месцах памяці інфармацыйна-мемарыяльных знакаў. Напрыклад, у лютым 2019 года на месцы былога нацысцкага канцлагера ў в. Лужасна была ўсталявана мемарыяльная дошка. На помніках і пахаваннях, дзе адсутнічала інфармацыя, устанаўліваліся інфармацыйныя шыльды. У 2021 годзе яны з’явіліся ў вёсках Чырвоны Двор, Буяны, Храпавічы, Трыгубцы. Вядзецца пэўная асветная і навуковая праца. За 2021 год запісаны тры відэасюжэты для абласнога і рэспубліканскага тэлебачання, апублікавана 12 артыкулаў у СМІ. Напісана навуковая работа «Выяўленне імёнаў і захаванне памяці пра ахвяр вайны ў Віцебскім раёне», якая на Рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару па гісторыі ў 2022 годзе атрымала дыплом II ступені.

Наступнай вясной плануем усталяваць шыльды на месцах масавага знішчэння мірных грамадзян каля вёсак Вялікая Любшчына, Храпальна, у г. п. Сураж, на месцы былога канцлагера каля вёскі Бараўляны і ў іншых. А таксама працягнем выяўляць невядомыя пахаванні, устанаўліваць імёны ахвяр вайны, уносіць іх у аб’яднаны банк даных «Кніга Памяці Віцебскага раёна».

Спадзяёмся, што наш досвед будзе карысны тым, хто займаецца пошуковай працай. Лічым, што ў Год гістарычнай памяці было б актуальна правесці шырокую дыскусію і абмеркаванне праблемных пытанняў, якія ёсць у справе ўвекавечання і асабліва ў запаўненні абласных і раённых «Кніг Памяці». Неабходна, на наш погляд, правесці больш дасканалую інвентарызацыю воінскіх пахаванняў і ўлік месцаў, якія звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны і вартыя мемарыялізацыі. Пакуль яшчэ жывыя сведкі вайны, людзі, якія ведаюць пра падзеі вайны ў краі, запісаць іх успаміны. Уключыць у камісіі па ўвекавечанні краязнаўцаў, актывістаў пошукавага руху, матываваць іх да сумеснай дзейнасці. Важна падрыхтаваць Звод помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны ў кожным раёне і вобласці краіны. Прыняць на ўзроўні раёнаў пастановы

аб наданні ахоўнага статусу помнікам вайны. Паскорыць працу па выяўленні імён ахвяр вайны і занясення іх у аўтаматызаваны банк даных «Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь». Разгледзець пытанне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці помнікам вайны, якія маюць высокую мастацкую і эстэтычную вартасць, звязаны з важнымі падзеямі вайны. Правесці мемарыялізацыю найбольш значных месцаў, звязаных з падзеямі вайны, шляхам узвядзення мемарыяльна-інфармацыйных шыльдаў. Пачаць працу па размяшчэнні на помніках і памятных знаках QR-кодаў з пашыранай інфармацыяй (імёнамі, абставінамі, ілюстрацыямі). Бачыцца важным распрацаваць праект універсальнага помніка – памятнага знака, прысвечанага ахвярам вайны, на месцы спаленых населеных пунктаў.

Усё забываецца, але тыя незлічоныя страты, беды і пакуты, якія нанесла беларускай зямлі апошняя вайна, мы павінны помніць. Помнікі, магілы загінулых і памятныя месцы будуць перашкодай для тых, хто жадае перагледзець вынікі вайны, абясцэніць подзвіг нашага народа.

***Фота аўтара***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 12.04.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и сохранении памяти о жертвах войн [Электронный ресурс]: Указ Президента Республики Беларусь, 24 марта 2016 г., № 109 // kodeksy-by.com. – Режим доступа: https://kodeksy-by.com/norm_akt/source-Президент%20РБ/type-Указ/109-24.03.2016.htm. – Дата доступа: 12.11. 2021 г.
2. О Государственной программе «Увековечение памяти о погибших при защите Отечества» на 2021–2025 годы [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 26 февраля 2021 г., № 117 // Эталон. – Режим доступа: https://etalonline.by/document/?regnum=c22100117. – Дата доступа: 12.01. 2022 г.
3. Об утверждении Правил благоустройства мемориалов, памятников воинской славы, воинских захоронений и захоронений жертв войн [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров Республики Беларусь, 17 сентября 2018 г., № 675 // Совет Министров Республики Беларусь. – Режим доступа: www.government.by/ru/solutions/3325. – Дата доступа: 12.11. 2022 г.
4. Инструкция о порядке государственного учета, переноса воинских захоронений и захоронений жертв войн, регистрации захоронений иностранных военнослужащих на территории Республики Беларусь и ведения автоматизированных банков данных [Электронный ресурс]: постановление Министерства обороны Республики Беларусь, 9 августа 2016 г., № 17 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3961&p0=W21631258. – Дата доступа: 12.01. 2022 г.
5. Инструкция о порядке проведения полевых поисковых работ с участием членов общественных объединений и граждан [Электронный ресурс] // Министерство обороны Республики Беларусь. – Режим доступа: https://www.mil.by/ru/forces/structure/nach_guir/upzojv/law/index.php. – Дата доступа: 12.01. 2022 г.
6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць/ АН БССР; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Савецк. Энцыкл., 1985. – 496 с.
7. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. – Мінск: БЕЛТА, 2009. – 684 с.
8. Півавар, М.В. Звод помнікаў воінскай славы, памятных месцаў, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр Вялікай Айчыннай вайны Віцебскага раёна / склад. М.В. Півавар. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. – 134 с.
9. Спаленыя вёскі Беларусі [Электронны рэсурс] // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: db.narb.by/search/?title=&titles=old&region=&district=7&year=. – Дата доступу: 23.11. 2021 г.
10. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 256. Воп. 1. Спр. 3.